Кавалёў Я.А., магістрант ФІДК
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Смолік А.І.,
доктар культуралогіі, прафессар

# ДЗЕЙНАСЦЬ МУЗЕЯЎ БЕЛАРУСІ ПА МУЗЕЕФІКАЦЫІ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ РАЁНАЎ, ПАЦЯРПЕЛЫХ АД АВАРЫІ НА ЧАЭС

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аварыя на ЧАЭС стварыла не толькі цэлы шэраг сацыяльна-эканамічных праблем, але і праблему захавання матэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны пацярпелых тэрыторый. Унікальныя помнікі гісторыі і этнаграфіі, сведчанні развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры жыхароў Усходняга Палесся і Падняпроўя, адных з найбольш архаічных і цікавых гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Еўропы, аказаліся перад пагрозай знішчэння ў выніку зыходу чалавека з гэтых мясцінаў. Пагроза зыходзіць не толькі ад марадзёраў, але і ад прыроды. Каштоўнейшыя артэфакты паступова гінуць у выніку пажараў, абвалаў стрэх пакінутых хат, дажджоў і павадкаў.

Для вырашэння праблемы музеефікацыі артэфактаў культуры пацярпелых тэрыторый, у 1991 г. была створана Дзяржаўная экспедыцыя па выратаванню помнікаў гісторыі і культуры Беларусі ў раёнах, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Дзейнасць гэтай арганізацыі была цесна звязана з такімі музеямі як Музей старажытнабеларускай культуры ІМЭФ АН Беларусі і Беларускі дзяржаўны музей народай архітэктуры і побыту, якія першыя пачалі праводзіць навуковыя экспедыцыі з мэтай выратавання і фіксацыі пакінутых каштоўнасцей. Усяго за перыяд з 1991 па 2001 г. было вывезена з забруджаных тэрыторый больш за 3 тыс. прадметаў этнаграфіі і народнага мастацтва. Асноўная большасць гэтых матэрыялаў легла ў аснову стварэння экспазіцыйнага раздзела “Помнікі мастацтва і этнаграфіі чарнобыльскай зоны”, які з’яўляецца часткай Музея старажытнабеларускай культуры [4, с. 221].

Пад час музейных экспедыцый праведзеных галоўным захавальнікам Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту В. Малюшынай, было вывезена каля 1,5 тыс. прадметаў этнаграфіі і народнага мастацтва (з зоны адсялення і прылеглых тэрыторый) [1, с. 3]. Аднак па прычыне таго, што з плануемых 6 гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў цалкам дабудаваны толькі 3 (Цэнтральная Беларусь, Паазер’е, Падняпроўе) Помнікі, вывезеныя пад час экспедыцый у адселеныя вёскі Гомельшчыны плануецца размясціць у будучым створаным рэгіёне Усходняе Палессе. Таму на сённяшні момант, амаль усе яны знаходзяцца ў фондасховішчах.

Акрамя гэтых музеяў, асобна неабходна вызначыць працу па выратаванню помнікаў культуры пакінутых весак Падняпроўя, супрацоўнікамі Веткаўскага музея народнай творчасці. Актыўная экпедыцыйная дзейнасць дазволіла вывезці 316 прадметаў іканапісу, старадрукаў, прадметаў этнаграфіі і народнага мастацтва. У 2008 г. пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі РБ было выдадзена навуковае выданне “Голоса ушедших деревень”, у якім прадстаўлена мастацкая культура і традыцыі вёсак, страчаных у выніку наступстваў Чарнобыльскай трагедыі [3, с. 3]. Дадзенае выданне з’яўляецца адзіным ў Беларусі, якое прысвечана тэме выратавання і інтэрпрэтацыі помнікаў культуры тэрыторый, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС.

Вельмі цікавым у гэтым кірунку з’яўляецца вопыт працы стваральнікаў Музея народных промыслаў і раместваў у г. Нароўля. Адкрыццю гэтага музея (2005 г.) папярэднічала актыўная экспедыцыйная дзейнасць, якая дазволіла прадставіць больш 500 экспанатаў. Значная частка гэтых матэрыялаў была вывезена з пакінутых населяных пунктаў Нараўлянскага і Ельскага раёнаў. Дзякуючы гэтаму былі створаны ўнікальныя раздзелы экспазіцыі, прысвечаныя прадукцыі кавальскай справы (экспануюцца калекцыі кос, сярпоў XIX-XX ст., сякер, замкоў пач.-сяр. XX ст., цвікоў і інш) і рыбалоўства (калекцыя грузілаў і паплаўкоў XIX – сяр. XX ст. Аднак

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

галоўная унікальнасць гэтага музея складаецца ў комплекснай музеефікацыі прадметаў матэрыяльнай культуры забруджаных тэрыторый. У экспазіцыі Музея народных промыслаў і рамёстваў прадстаўлены шэраг побытавых прадметаў, легкай прамысловасці СССР перыяду 1960—70-х гг., якія дапамагаюць прасачыць трансфармацыю прадмета і прадставіць наведвальніку асаблівасці жыцця савецкага грамадства.

Узгаданая тэндэнцыя на музеефікацыю усяго пласта матэрыяльнай культуры звязана ў першую чаргу са змяненнем у сучасных умовах паняцця “Культурная спадчына”, ідэя якой ў пэўнай ступені згубіла сэнс. Усё створанае і назапашанае ў мінулым ўспрымаецца зараз як каштоўнасць. Такім чынам помнікам культуры можа стаць абсалютна ўсё [2. с. 146]. У такіх умовах дэструктыўныя наступствы Чарнобыльскай аварыі ствараюць ўнікальныя і фактычна нерэалізаваныя магчымасці для музеефікацыі ўсяго комплекса артэфактаў матэрыяльнай культуры.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. З чарнобыльскага пепла /В. Малюшына.-Беларуская Мінуўшчына №1. 1994 г.

2. Калугина, Т. П. Художественный музей как феномен культуры / Т.П. Калугина. – СПб.: Петрополис, 2001. – 148с.

3. Нечаева, Г.Г. Голоса ушедших деревень / под общ. ред. Г.Г. Нечаевой.-Минск: Белорус. наука, 2008. -342 с., ил.

4. Чарнобыль. Погляд праз дзесяцігоддзе: Даведнік / Пад рэд. Я.В. Малашэвіч — Мн.: БелЭнц., 1996.-319 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ